# «АРТ-Жыжаль» прыехаў у Мінск

***З 5 па 25 кастрычніка ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» праходзіць выстаўка «Кераміка ночы» па выніках XIII Міжнароднага пленэра па кераміцы «АРТ-Жыжаль» – адной з найбуйнейшых падзеяў у сферы культуры Беларусі.***

Пленэр праводзіцца 13 гадоў пад кіраўніцтвам вядомага кераміста, лаўрэата Спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў сферы мастацтва Валерыя Калтыгіна і пры арганізацыйнай падтрымцы Бабруйскага гарвыканкама, упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама, Бабруйскага мастацкага музея імя Г.Г. Паплаўскага, Бабруйскай гарадской арганізацыі Беларускага саюза мастакоў.

Цікавая тэма пленэра – «Чалавек у асяроддзі пражывання», што накіравала мастакоў на стварэнне цудоўных твораў. Дэвіз мерапрыемства – «З традыцыі ў сучаснасць праз майстэрства». Гэтам самым майстэрствам дзяліліся больш як 20 майстроў-керамістаў з Беларусі, Латвіі, Літвы, Малдовы, Польшчы, Расіі, Украіны, Францыі, Японіі. Кожны з іх – прадстаўнік унікальнай мастацкай школы, таму не дзіўна, што бабруйскі рэгіён, дзе традыцыйна ладзіцца пленэр, уяўляе сабой прастору міжкультурнага дыялогу, які ў сваю чаргу на тры кастрычніцкія тыдні перанёсся ў памяшканне сталічнай галерэі праз мастацкія творы з увасабленнем у іх аўтарства інтэрнацыянальнай каманды мастакоў.

*Павел САПОЦЬКА*







РЕПОЗИТОРИЙ ...УКИ